№. 9. Вільня, Нядзеля, 14 Сакавіка 1926 г. Год II.

СЯЛЯНСКАЯ НІВА

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
Вільня, Завальная вул. 7. — (Wilno, ulica Zawalna 7).
Рэдакцыя адчынена штодня ад 9 да 6 гадзіны апрача сьвята.
Газэта выходзіць раз у тыдзень.
Падпіска на адзін месяц 1 зл., на 3 мес.—2 зл., на 6 мес.—4 зл., на год—8 зл.
Перамена адрэсу 30 гр.

Цана абвестак:
на 1 старонцы 30 грошаў, на 2 і 3 — 25 грошаў і на 4 — 20 грошаў за радок дробнага друку ў ваднэй палосцы. Жадаючыя іншых абвестак павінны зьвярнуцца да Адміністрацыі.

Орган Беларускага Сялянскага Саюзу.

Ці мы дзелім?

Пасьля закладзінаў Беларускага Сялянскага Саюзу і выхаду ў сьвет „Сялянскае Нівы“ на закладчыкаў незалежнага клясавага руху сялянскага пасыпаліся з боку прыхільнікаў камуністычнае ўлады закіды, што гэты рух дзеліць сялянаў і работнікаў. Гэткія закіды няраз сустракаем у газэце „Беларуская Ніва“. Гэтак у № 6 сёлетняга году „Белар. Нівы“ у стацьці „Селянін і работнік“ рэдакцыя вініць нас у гэтым; падчыркуе, што „усюды і заўсёды іменна работнікі першыя працавалі і працуюць над усьведамленьнем і арганізацыяй сялянскіх сіл — дзеля здаваленьня адвечнага імкненьня сялянства да зямлі. Сколькі такіх работнікаў-змагароў за зямлю згнаілі расейскія царскія вастрогі“.

Што работніцкі рух у *сваіх* асвабаджэньнях стараўся выкарыстаці дзеля *сваіх* мэтаў сялянства — гэта сусім зразумела. Сялянства ў усіх краёх прадстаўляла, хоць і адсталую, але вялізарнаю сілу, не скарыстаці з гэтае сілы было-б неразумна. Таксама карыстала з работнікаў і сялянаў мяшчанства-буржуазія, як асвабаджалася ад рыцароў-паноў. Але як мяшчане, так і работнікі вылучна гэта рабілі дзеля *свае* карысьці. Работніцкі рух на‘т вытварыў у сябе такія партыі, каторых праграма была процілежна сьветапаглядy, жаданьням і патрэбам сялянскім. Гэтак сацыял-дэмакратычная партыя імкнецца да таго, каб із усяе (і сялянскае ўласнае) зямлі вытварыліся вялікія двары, у якіх усе сяляне былі-б работнікамі-парабкамі, і, як работнікі, супольна з работнікамі хвабрычнымі ходаліся-б і з хвабрыкантамі і панамі. Хто-ж із сялянаў згодзіцца на гэтакі работніцкі „ідэал“? Што інтарэсы сяляніна і работніка ня сходзяцца і што работніцкія партыі ня могуць здаволіці сялянаў, гэта паглядна бачым у тых краёх, дзе работніцкія партыі ў тэй ці іншай меры дасталі ў свае рукі ўладу, прыкладам у Нямеччыне, Чэхаславаччыне, Баўгарыі. У-ва ўсіх падобных краёх нямінуча ўзьнікаюць сялянскія партыі ці саюзы, каб абараніціся ад аднабокае работніцкае ўлады. Ня ўзьнікаюць гэтыя сялянскія партыі толькі там дзе, дзе іх арганізаваць не пазваляюць, як напр. у СССР.

Але няхай нам „Беларуская Ніва“ выбачыць. Мы запраўды ня ведаем такіх работнікаў, што ўміралі за зямлю сялянам. Ня можам ведаць, бо такіх работнікаў ня было. Былі сяляне, якія пакуль ня было клясавага руху сялянскага, сялянскіх саюзаў, належылі да работніцкіх партыяў і запраўды, паколькі ў іх работніцкі кірунак партыі ня здолеў забіці сялянскага пачуцьця, ходаліся і ўміралі за зямлю сялянам. Але вось гэтыя сяляне і пабачылі, сваім дазнаньнем пераканаліся, што не работніцкім партыям вызваліці сялянства з яго матар‘яльнай і духовай няволі. Пабачыўшы гэта, яны заклалі свой клясавы Беларускі Сялянскі Саюз.

Але адкажам на пытаньне, ці дзеліць беларускі рух сялянскі сялянства і работніцтва? Мусім адказаці, што ня дзеліць. Ня дзеліць наўперад дзеля таго, што нямашака чаго дзяліці, нямашака жаднага супольнага сялянска-работніцкага жыцьця, нямаш жаднае сялянска-работніцкае арганізацыі. У гэтым і ўся трагэдыя тых, каторыя крычаць аб патрэбе супольнай сялянска-работніцкай арганізацыі, што дагэтуль у Беларусі яны яе не стварылі; але яшчэ горэй, што не стварылі ані сялянскай арганізацыі, бо лічылі, што арганізацыя мае выходзіць ад работнікаў, ані работніцкай, бо заместа канкрэтнай працы сярод беларускага работніцтва, займаліся бясплодным намаўляньнем сялянаў да супрацоўніцтва з неарганізаванымі работнікамі і паслухмянасьці ім. Апошнімі часамі можна заўважыць, што „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада“ робіць свае вечы ў мястох—Горадне, Беластоку і іншых. Калі-б гэта не абмежыліся аднымі вечамі. калі-б арганізацыя беларускіх работнікаў пайшла глыбей, стварыліся беларускія арганізацыі работніцкія, тады можна было-б гаманіці аб адносінах беларускіх сялянаў да беларускіх работнікаў.

Але мусім зрабіці адну засьцярогу. Работнікаў у Беларусі ёсьць вельмі мала, толькі некалькі працэнтаў. І ў гэтай малай лічбе большасьць складаюць не работнікі беларусы, але пераважна іншыя. Ад гэткага складу работніцкіх арганізацыяў мы не спадзяёмся жаднага дабра беларускім работнікам, а сялянству ад іх чыстая згуба. З прычыны такога складу камуністычнае партыі Радавай Беларусі, сялянаў беларусаў там высяляюць у Сібір і іншыя далёкія краі, а на іхняю роднаю зямлю садзяць жыдоў. Дык на наш розум беларускія работнікі маюць арганізавацца асобна, у свае нацыянальныя (няхай і сацыялістычныя) арганізацыі работніцкія. Проці гэткіх работнікаў беларускіх, беларускае сялянства ня будзе нічагусенькі меці і з імі зьмяркуецца.

Але калі-б і так сталася ў работніцкім руху беларускім, як мы лічым патрэбным, усё-ж такі беларускае сялянства мусіць меці свае арганізацыі. асобныя ад работніцкіх. Мусіць гэта быць з дзьвюх галоўных прычынаў: 1) Работнікаў беларусаў ёсьць якіх 2—3%, тады як сялянаў ёсьць ля 95%. Ня можна долі гэткае вялікае лічбы сялянаў рабіці залежнае ад таго *як* пойдзе развіцьцё работніцкага руху. Вышэй было паказана, што работніцкія партыі ня могуць здаволіці патрэбаў сялянскіх, а напару бываюць сялянам і шкодны, як прыкладам польская партыя сацыялістычная або камуністычная партыя Беларусі (не беларуская). Апрача сказанага вышэй тутака прывяду яшчэ адзін прыклад. Як не нягодна жывецца ў Польшчы работнікам, а ўсё-ж такі да работнікаў адносяцца шмат ляпей, як да сялянаў. Гэтак значная частка работнікаў, нямаючых працы, дастае памогу ад гаспадарства. Гэта зусім справядліва, ня толькі гэная частка, але ўсе безработныя павінны былі-б даставіці гаспадарсьцьвенаю памогу. А цяперака папытаемся: ці безработных сялянаў нямашака? Есьцека безработныя дзеля таго, што не хапае зямлі, або апошняю семіну мусіў прадаці на падаткі, або каня заганялі хурманкамі і ён даўся, і ці мала іншых прычынаў, незалежных ад нашага сяляніна, прынукаюць яго аставаціся без занятку—працы. Усе гэтыя незанятыя сялане маюць права, як і работнікі, на памогу ад гаспадарства. Але ці знайшлася хоць адна работніцкая партыя, што ўступілася-б за сялянаў і дамагалася-б ім гэтага? Гэткае партыі не знайшлося наўперад дзеля таго, што работніцкія кіраўнікі проста аб сялянах ня думаюць. За гэта сялянства ня мае злаваці на работнікаў, будзе справядлівей, калі будзе злаваці само на сябе, што не ўзялося за самаарганізацыю. „Ніхто сабе не ліхадзей“ кажа беларуская прыказка. Гэтак сталася і гутака. Пакуль была адна работніцкая арганізацыя і кіравала разам работнікамі і сялянамі, рупілася найболей, а то і вылучна, аб работніках; аб патрэбах сялянскіх або забывалася, або сялянам шкодзіла. А цяперака, калі пачалася арганізацыя сялянская, арганізаваныя сяляне самі аб сваіх патрэбах будуць рупіціся і толькі самі здабудуць сялянству лепшую долю.

2) Інтарэсы сялянаў і работнікаў розныя. Па меры таго, як сяляне і работнікі будуць даходзіць лепшага, справядліўшага быцьця, розьніца гэтая інтарэсаў будзе павялічаціся. Калі дойдзе той жаданы час, што ў вёсцы ня будзе паноў, а ў мястох капіталістаў-хвабрыкантаў, ды гандляроў-спэкулянтаў — работнікі і сяляне, як места і вёска, будуць пастаўлены адны проці адных. Адны з іх будуць заняты хвабрычнымі вырабамі і з гэтага браці ўсю карысьць сабе, другія (сяляне) будуць заняты першавырабам, зьбіраньнем з Маці-Зямлі збожжа і г. п. і гадоўляй жывёлы. Месты будуць патрэбаваці хлеба, мяса і г. п., а вёска мястовых вырабаў. Работнік і селянін будуць у вадносінах да сябе, як купец і прадавец і наадварот, ці, іначай кажучы, як тавараменьннікі. У гэтай таварамене, каб ня быў жадны пакрыўджаны, не павінен адзін ад аднаго залежыць, бо адны тагды будуць магчы свабодна старгавацца. Гэта-ж можа стацца, калі як сяляне, так і работнікі будуць мець свае асобныя клясавыя арганізацыі.

Арганізаваныя асобна сяляне і работнікі будуць злучаны з сабой належнасьцяй да аднаго Беларускага Народу і паміж імі будзе лепшае сужыцьцё, чымся каб адны імкнуліся да панаваньня, а другія прымушаны былі бараніцца.

Пачаўшы арганізацыю Беларускага Сялянскага Саюзу беларускія сяляне маюць арганізаваці яго да канца, каб ён абняў усё беларускае сялянства і дапяў сялянскіх ідэалаў. Дык гэтаю арганізацыю беларускія сяляне робяць не з ненавісьці да работнікаў, якой у іх нямаш, але дзеля абароны сялянскіх правоў і ўжыцёўленьня сялянскіх ідэалаў. Спаўненьне гэтага будзе карысна і работнікам.

Максім Прынскі.

ПРАМОВА

пасла Б. Рагулі ў Сойме 2 сакавіка 1926 г. ў справе ратыфікацыі дагавораў у Лёкарно.

Ад імя Беларускага Клюбу я мушу ўзяць голас у дыскусыі над уставай ратыфікацыі дагавораў, прынятых у Лёкарно.

Прынцып мірнага вырашэньня міжнародных спрэчак, пэўна-ж, павінен быць спатканы прыхільна праз усе народы. Аднак дарога, якой вялікія дзяржавы ідуць да гэтае мэты, мусіць быць паддана безварунковай крытыцы. Пачынаючы з Вэрсальскага дагавору, які быў вынікам аружнае перавагі аднэй староны, далей пераходзячы да Жэнэўскага пратаколу, абапёртага на трох асновах: арбітражы, бяспекі і разаружэньня і канчаючы на г. зв. Лёкарнскіх дагаворах, урады часткі Эўрапэйскіх дзяржаў сіляцца стварыць штучны спакой Эўропы, зусім абмінаючы справу народаў паняволеных. Справа прыгнечаных народаў ёсьць адзіным галоўным фактарам, які можа дэцыдаваць аб будучай вайне. Роўна трактат Вэрсальскі, як і Рыскі і апошнія дагаворы ў Лёкарно зусім забыліся аб прынцыпе самавызначэньня народаў, пакідаючы паняволеныя народы на ласку ці няласку чужых ім урадаў. Зусім закінуты прынцып самастанаўленьня народаў аб іх уласным лёсе, а замест яго прыняты прынцып аружнае перавагі, перавагі грубой сілы фізычнай, якую тасуюць цяперашнія ўрады з імпэр'ялістычнымі імкненьнямі і гэтыя ўрады, яшчэ, дарогаю міжнародных дагавораў, хочаць замацаваць існуючы стан рэчаў, маючы на мэце яшчэ большы ўціск паняволеных народаў і поўнае іх зьнішчэньне. Польшч пад гэтым паглядам займае першае месца ў Эўропе, бо яна захваціла ў свае граніцы землі заселеныя густой масаю народамі ня польскімі.

Як ні адна дзяржава ў Эўропе, Польшч мае 40% нацыянальных меншасьцяў, якія, фактычна, зусім пазбаўленыя грамадзянскіх правоў, сталіся нявольнікамі, над каторымі польскія ўрадоўцы зьдзекуюцца так, як гэта рабілі амэрыканцы з нэграмі. А асабліва т. зв. „Крэсы Ўсходнія" дазнаюць гэтае няволі. Два з лішкай мільёны Беларускага Народу пад Польшчаю ўжо ў працягу 7 гадоў пераносяць самаволю, надужыцьці і гвалты з боку паліцыі, сышчыкаў і іншых польскіх урадоўцаў. Кожны беларус залічаецца да камуністаў і пад пратэкстам змаганьня з камунізмам паліцыя арыштовывае дзесяткі тысячаў беларусаў, паддае іх часта нялюдзкім мучэньням, як дзікім катаваньням, паеньнем карасінай, дапросамі пры помачы электрычнага току і т. пад.

На беларускіх землях улада польская сіліцца стварыць унутранае Лёкарно, Лёкарно сьмерці, унутраны спакой — спакой магілы. Пасьля ўсяго, што творыцца на нашых землях, кожны беларус, у словах п. мін. Скшынскага аб праве, справядлівасьці, аб тым, што не павінна быць, ані пераможцаў, ані пераможаных, можа бачыць толькі цынізм дыпляматычны, пасунуты па-за ўсялякія магчымыя граніцы, які адкрыта сваімі словамі і дзелам даказвае слушнасьць цьверджэньня вядомага расейскага дзеяча Мілюкова, што палітыка гэта ашуканства. (Голас: ошуство?). Скажу пану парасейску: „политика это мошенничество".

Пану мін. Скшынскаму трэба было-б ведаць пэўнік, што вонкавы спакой можа быць запэўнены толькі праз спакой унутраны. Калі ня будзе ўнутранага спакою, дык ня можна спадзявацца і на вонкавы спакой. Пан мін. Скшынскі раз ужо патрапіў задэманстраваць у Жэнэве нібы-то талерацыю польскую, адносна да нацыянальных меншасьцяў, аб т. зв., ужо нябошчыках, языковых уставах, аб школьніцтве для меншасьцяў, аб украінскім універсытэці, і ў гэты спосаб збаламуціць сваіх эўрапэйскіх калегаў. Тым-часам, што-ж мы маемо ў Польшчы? Адказ кароткі, але балючы. Маем вастрогі, нялюдзкае катаваньне насяленьня падчас дапросаў, маем уціск нацыянальны, школьны і рэлігійны, абсалютнае зьнішчэньне беларускае культуры. І гэта зайшло так далёка, што ўлада польская ў зародку зьнішчае ўсялякае пачынаньне з мэтай адкрыцьця прыватнае пачатковае беларускае школы, арэштуючы вучыцялёў і штрафуючы сялян у хаце, у якіх адбывалася навучаньне ў роднай мове.

Гэты самы польскі шавінізм, злучаны з бяспраўем, праяўляецца і ў іншых галінах урадавае палітыкі.

Справа ліквідацыі сэрвітутаў, вайсковае асадніцтва і калянізацыя нашых зямель праз польскі элемэнт,—занадта яскравыя факты, якія сьведчаць аб поўным уціску і вызыску беларусаў праз Польшч.

Значa, покуль не наступе ўнутрананае Лёкарно, ня можа быць мовы аб Лёкарне міжнародным, маючым забясьпечыць вонкавы спакой.

Дзеля гэтага жадаем, каб для беларускага народу было застасавана поўнасьцю самавызначэньне, каб беларускі народ быў трактаваны згодна з засадай—вольныя з вольнымі, роўныя з роўнымі. Жадаем незалежнасьці Беларусі з урадам не работніцка-сялянскім, а **сялянска**-работніцкім.

Заяўлаю ад імя майго клюбу, што будзем галасаваць проці ратыфікацыі трактатаў.

Ува ўсіх справах датычачых арганізацыі

Беларускага Сялянскага Саюзу

і запісі ў сябры просім зьвяртацца па адрасу:

m. Wilno, ul. Połocka 4 m. 7.

Беларускі Сялянскі Саюз.

Суд над кс. беларусам В. Гадлеўскім.

1-га марца ў Віленскім Акружным Судзе адбыўся разгляд справы беларускага дзеяча ксяндза В. Гадлеўскага. Старшынстваваў на судзе судзьдзя Овсянко. Баранілі кс. Гадлеўскага адвакаты-паслы Сьмяровскі і Лібэрман, абодва прадстаўнікі польскае дэмакратыі.

Суд адбываўся пры зачыненых дзьверох. У салю суда быў дапушчаны, як „муж даверыя" падсуднага, пасол кс. Станкевіч і другія ксяндзы беларусы.

Разам з кс. Гадлеўскім судзілі і грам. Рагача. Абодвух вінавацілі ў „антыпаньствовай" агітацыі—на карысьць незалежнасьці Беларусі і за адарваньне Заходняе Беларусі ад Польшчы.

Суд закончыўся 2-га сакавіка а 2 гадзіне папалудні абвяшчэньнем прыгавару, якім кс. Гадлеўскі прызнаны вінаватым у падбураньні людзей у прыватных гутарках да паўстаньня да адарваньня Беларусі ад Польшчы і стварэньня незалежнае Беларусі. За гэта кс. Гадлеўскага засудзілі на два гады крэпасьці. Грам. Рагач судом апраўданы.

Абаронцы кс. Гадлеўскага зявілі, што прыедуць ізноў у Вільню бараніць гэтага беларускага дзеяча ў Апэляцыйным судзе—і таксама бясплатна, як гэтым разам баранілі.

На просьбу абароны суд пастанавіў звольніць кс. Гадлеўскага пад залог у ліку 2000 зл., якія ўраз-жа былі сабраны і паложаны прысутнымі.

У судовым гмаху—перад дзьвярыма суда — сабралася каля другое гадзіны да сотні прадстаўнікоў беларускага грамадзянства і моладзі—з кветкамі, каб прывітаць кс Гадлеўскага. Убачыўшы кветкі і зразумеўшы, ў чым справа, паліцыя выгнала ўсіх на вуліцу. Але тут — на вуліцы і на Лукішскім пляцы — чакала ўжо ня сотня, а тысячная грамада народу, зложаная з работнікаў, мяшчан і інтэлігэнцыі, якая, даведаўшыся аб судзе, пасьпяшыла выказаць свой спогад беларускаму барацьбіту. Пешая і конная паліцыя прабавала разагнаць народ, але дарэмна: ніхто не скрануўся з мейсца—усе чакалі выхаду кс. Гадлеўскага.

Урэшце засуджаны паказаўся ў дзьвярах суду. На рагу Лукішскага пляцу і Юраўскага праспэкту яму былі пададзены кветкі, і, як ён пайшоў па Юраўскім праспэкце (вул. Адама Міцкевіча) уся гэная таўпа рушыла сьледам за ім. Гэтак стварыўся дэманстрацыйны паход, як першая ў Вільні чыста беларуская нацыянальная маніфэстацыя.

Агенты палітычнае паліцыі кідаліся да кс. Гадлеўскага з лаянкай, і толькі прысутнасьць некалькіх беларускіх паслоў перашкодзіла горшым зьдзекам над засуджаным.

Усе патугі пешых і конных паліцыянтаў спыніць паход нічога не дапялі. Маніфэстанты прайшлі ў поўным парадку і супакою праз увесь праспэкт і разыйшліся толькі тады, калі кс. Гадлеўскі сеў на возьніка і паехаў на, прыгатаваны для сябе праз беларусаў, абед.

З нядаўнага мінулага Пружаншчыны.

Тры гады мінае з таго часу, як зьявілася ў Пружанскім павеце новая ідэя-беларускае адраджэньне. Перш, чым перайсьці да суці, мушу сказаць чытачам, чым быў Пружанскі павет у беларускім руху таму 3 гады. Пружанскі павет быў самым несьвядомым паветам у Заходняе Беларусі. Сяляне нашага павету да 1921 г. ня мелі нават найменшага разуменьня аб беларускім руху. Адною з найгалаўнейшых прычынаў гэтае адсталасьці ёсьць несьвядомасьць інтэлігэнцыі, якая пайшла на службу да расейцаў або да палякаў, пакінуўшы свой народ на самога сябе. Гэта адзін з найбяднейшых паветаў, які ня меў такіх людзей, каб узварушылі тую шэрую, сялянскую масу, якая спала непрабудным сном. І, як доўга цягнуўся-б гэты сон, —труда было-б сказаць, каб не зьявіліся „людзі", якія сваей упорнай працай далі пачаткі беларускай сьведамасьці і пралажылі шлях да беларускага адраджэньня. Цяжкая была гэтая праца!...

Думаю, што многім добра зразумела „лёгкасьць" гэтай працы сярод тых людзей, якія ня маюць абсалютна ніякога разуменьня аб слове „беларускасьць". А гэтую працу, як і бываець звычайна, пачаў адзін чалавек. Насеньне кінута на добры грунт. Яно ўжо глыбока запускаець свае корэньні ў гушчы сялянскіх масаў і ўсходзіць сьвежая рунь. Кадры сьвядомых працаўнікоў павялічваюцца. Ужо няма амаль што ні аднэй вёскі, каб не цікавіліся беларускаю школаю, газэтамі і іншымі праявамі беларускага жыцьця. Ня гледзячы на тыя перашкоды, якія робяцца з боку польскай адміністрацыі і на той яе рэжым (нашыя паслы аб гэтым добра ведаюць!), стасаваны да сялян, беларуская сьведамасьць сярод людзей распаўсюджываецца шпаркім тэмпам. Праўда, сваею палітыкаю польская ўлада да некатарай ступені, хоць можа быць несьвядома, памагаець ідэі беларускае сьведамасьці. Затое пладамі гэтае палітыкі зьяўляюцца тыя „новенькія домікі" асаднікаў, пабудаваныя на беларускай зямлі і за народны крывавы грош. Гэтых домікаў у нашым павеце столькі напладзілася, што куды не павярніся, дык аж жудасна робіцца. А, калі нешта дразьніць нашага сяляніна, тагды толькі ён узварушываецца, падымаецца ад цяжкага сну і пачынаець шукаць тых шляхоў, якія-б дапамаглі яму выбрацца на дарогу праўды.

Калі, якім чынам пачаў пашырацца беларускі рух у Пружаншчыне?

Было гэта ў канцы 1921 года. Аднаго разу ў Пружанах у доме вучыцелькі К., дзе часта зьбіралася шмат беларускіх вясковых вучыцялёў і вучыцялек (вядома з польсвіх школаў, бо беларускіх нябыло і ўспаміну), трапілася такая нагода. Вучыцель Ш., які знайшоўся ў доме гэнае вучыцелькі, пабачыў на стале беларускія друкі: „Беларускі Звон", „Кгупіса" і іншыя. Гэтыя газэты зьвярнулі яго ўвагу. Ён узяў і прачытаў. Відаць, што яму надта спадабаліся гэтыя газэты, бо за хвілю сказаў:—„я абавязкова выпішу гэтыя газэты!" Слова датрымаў. У яго хутка паявіліся ўпамянутыя газэты. Мала таго, за нейкі час выпісаў і „Беларускія Ведамасьці", а потым і ўсю беларускую літэратуру. Адным словам, за нядоўгі час у яго зьявілася маленькая бібліотэчка. Як галодны воўк накінуўся на беларускія кніжкі! Ну, а вядома, прачытаўшы сам, пачаў чытаць і распаўсюджываць беларускае слова сярод сялян.

Сялянам надта спадабаліся беларускія кніжкі. Яны страшна зьдзівавaліся, што ў іхняў „мужыцкай" мове ёсьць напісаны кніжкі. Адзін селянін чамусьці заўважыў, шты гэтыя кніжкі напісаны „жыдамі". Ня ведаю, ці ўжо наш селянін прывык так разважаць, што дзе толькі нешта робіцца, дык абавязкова там мусяць быць жыды! Вясковыя кабеты любілі слухаць апавяданьні Ядвігіна Ш. Прачытаўшы раз, яны хацелі яшчэ другі, трэці і без канца слухалі-б тых „Важных фіг", „Суды" і інш. — „Але дзіўна, — гаварылі яны, — той, хто напісаў гэтыя рэчы, як быццам сапраўды ён падслухаў дзенебудзь за вуглом гутарку нашае Грыпіны з Марылею".

Вось гэтым і быў зроблены зачатак новае белар. ідэі, гэтага новага этапу ў жыцьці Беларускагага Народу. І, як ня дзіўна, але ў гэтым выпадку выпала на долю зрабіць пачын маленькай мала-асьвечанай вёсцы Ліхачам (Котранскае волясьці).

Адна назова вёскі ўжо можа аб сабе сказаць. Як тая сірата стаіць яна ў даліне, ля лесу і балотаў... Мейсца, дзе разлягалася гэтая вёска ня больш ня менш, як нейкая яма. Як быццам ад нейкага страху схавалася яна сюды... Смутна! невясёла... Твар яе, здаецца, вечна такі нейкі нахмураны, невясёлы... Толькі вясной птушкі, лятаючыя над балотам, сьпевам і крыкам сваім прыносяць зьмену настрою гэтае вёскі...

Вось гэтая нахмураная, смутная вёска, у гэтай яме ля лесу і балотаў і зажадала таго, аб чым другім вёскам і ня сьнілася. Зажадалі сваю родную беларускую школу. На гэта мусіла быць вялікая адвага, калі ўзяць пад увагу тую атмасфэру, сярод якое жыў і жыве беларускі селянін. Атмасфэра густая, маючая ў сабе шмат для нашага селяніна газаў, атраўляючых яго жыцьцё.

Вечарам у школе (звычайная хата, адумысловага школьнага будынку няма заўсім), пры сьвеце „газовачкі" сабралося поўна гаспадароў. І носа не ўсадзіў-бы—так было набіта поўна! Гэта зыйшоўся сход, — сход, які будзе выносіць пастанову аб адкрыцьці школы ў роднай мове. Трэба зазначыць, што ў гэтай вёсцы была школа польская. Зьявіўся вучыцель, беларус, які вучыў дзяцей у школе папольску. Відаць зразумеў тую вялікую шкоду, якую робіць Беларускаму Народу сваею працаю... Зразумеў, што гэта ёсьць калечаньне душы беларускіх дзетак... Зразумеў—і апамятаўся... Ён-жа таксама сын Беларускага Народу, таго самага Народу, які вечна носіць кайданы нядолі... А, калі вясковы вучыцель, той інтэлігэнт, што ў найбліжэйшых стаіць адносінах да вясковых масаў, не зразумеець, дык хто-ж тагды можа зразумець?!... Але на жаль яшчэ мала ёсьць такіх „зразумелых"... Дзеля матар'яльных выгад, яны прадавалі і прадаюць Беларускі Народ... Мала таго—яны (як узяць такіх прадстаўнікоў, як вуч. Місюля, Карпюк) памагаюць варожым сілам „абдурываць" цёмных „мужыкоў".

Такім чынам, яны зьяўляюцца добрым і карысным аружжам улады дзеля правядзеньня польскае „крэсавае" палітыкі. Такіх Місюл і Карпюкоў у нашым павеце хоць адбаўляй!

Пры зьяве вучыцеля ў школе настала цішыня. Відаць, кожнага цікавіла, што будзець гаварыць вучыцель. Вучыцель стаў ля стала, трохі задумаўся (а было над чым задумацца), а потым, абвёўшы прысутных зорам, вымавіў:

ПЕРАСЬЦЯРОГА.

Газэта „Echo Warszawskie“ 3.III. г. г. № 50 зьмясьціла тэлеграму да старшыні пасольскага Соймавага Клюбу „Пяст“, пасла Вітаса, высланую з м. Пружаны ад імя нейкага „Крестьянского Союза“ і падпісаную А. Бухаўцом. Неўваходзячы сусім у зьмест той тэлеграмы, перасьцярагаем усіх сялян беларусаў, што польскія партыі, прадбачучы выбары, пачынаюць ізноў баламуціць беларускіх сялян, арганізоўваючы нейкія новыя „Крестьянскія Союзы“, якія нічога ня маюць супольнага з абаронай беларускага сялянства.

Адзінай палітычнай партыяй, якая сапраўды стаіць гарой за беларускае сялянства і арганізоўвае сялян для здабыцьця лепшай долі ёсьць БЕЛАРУСКІ СЯЛЯНСКІ САЮЗ — Вільня, Полацкая вул. № 4, кв. 7.

Сэкрэтарыят
Беларускага Сялянскага Саюзу.

З жыцьця арганізацыйнага Беларускага Сялянскага Саюзу.

Праект праграмы.

(Працяг).

VII. Лясы, воды і іншыя прыродныя багацьця.

§ 16. Лясы, воды, падземныя багацьця і іншыя становяць уласнасьць усяго народу.

§ 17. На патрэбы будаўляныя і на апал Сялянскія Зямельныя Камісіі пры Самаўрадах вызначаюць пэўны лік лесу, які дастаўляе сялянам дроў і будаўляных матар'ялаў.

VIII. Прасьвета.

§ 18. Беларускі Сялянскі Саюз дамагаецца абавязковай народнай прасьветы ў роднай мове.

§ 19. Навука ў школе пачаткавай, сярэдняй і вышэйшай павінна адбывацца бясплатна.

§ 20. Навука ў ніжэйшых, сярэдніх і вышэйшых школах павінна адбывацца ў роднай мове.

IX. Палітычныя і грамадзкія правы.

§ 21. Усе грамадзяне зьяўляюцца роўнымі прад правам.

§ 22. Кожны грамадзянін мае права берагчы сваю нацыянальнасьць і ўзгадовываць сваю мову і культуру.

§ 23. Беларускі Сялянскі Саюз дамагаецца поўнай свабоды сабраньняў (сходаў), друку, слова, арганізацыі ўсялякіх таварыстваў і прафэсыянальных саюзаў.

X. Рэлігія.

§ 24. Усе грамадзяне павінны карыстацца з свабоды сумленьня і рэлігіі.

§ 25. Каб урад ня мог падтрымліваць адну рэлігію на шкоду іншых, патрэбна, каб царква, касьцёл і іншыя рэлігійныя ўстановы былі аддзелены ад дзяржавы.

XI. Самаўрады.

§ 26. Беларускі Сялянскі Саюз дамагаецца шырокіх самаўрадаў, выбраных на аснове агульнага, простага, тайнага, роўнага і пропорцыянальнага галасаваньня.

§ 27. Справы адміністрацыйныя, гаспадарчыя, школьныя, зямельныя, бальнічныя і іншыя належаць да валасных, павятовых і акружных (ваяводзкіх) самаўрадаў.

§ 28. Самаўрады самастойна ўстанаўляюць буджэты прыходаў і расходаў, зацьвярджаюць (вызначаюць) усю валасную, павятовую і акружную адміністрацыю і спраўляюць над ёй кантроль.

XII. Суды.

§ 29. Суд павінен быць незалежны.

§ 30. Міравыя Суды складаюцца з выбранага судзьдзі.

§ 31. У-ва ўсіх важнейшых угалоўных і палітычных справах прыгавары выносяць суды прысяжных.

§ 32. Беларускі Сялянскі Саюз дамагаецца скасаваньня кары сьмерці і скасаваньня палявых (надзвычайных) судоў.

(Далей будзе).

Палесьсе і П. П. С.

Ад выбараў 1922 году, а нават і раней П.П.С. (Polska Partja Socjalistyczna) зьвярнула вялікую ўвагу на нашае Палесьсе, асабліва на Піншчыну. Зьвярнула ўвагу не дарма—там яна знайшла для сябе жніво, бо мусіць нідзе у самой Польшчы пэпээсы не атрымалі мандатаў у Сойм з вясковых акругоў, а на Палесьсі атрымалі... Цёмныя беларусы, забіўшыся ў свае балоты, паверылі пэпээсам і аддалі ім пры выбарах свае галасы. Вот мусіць затым і рынуліся польскія сацыялісты на нашае Палесьсе здабываць ізноў мандаты.

Сваю агітацыю яны вядуць даволі проста: наймаюць агітатараў і тыя раз'яжджаюць па вёсках абяцаючы ўсім **зямлю**, хто толькі запішыцца ў пэпээсаўскі камітэт. Гавораць папольску, або парасейску. А калі гавораць папольску або парасейску, у вачах народу яны мусіць нейкія „ужэндзікі“, маючыя сілу, бо нават і паліцыі не баяцца. Хай папрабуе які беларус прыехаць дый залажыць камітэт! Адразу возьмуць і яго і камітэт. Значыць пэпээсы маюць сілу і ануж дадуць зямлю... так разважае цёмны пінчук.

Гэтым мусіць і тлумачыцца тая ўдача польскіх сацыялістаў пры выбарах і пры цяперашняй агітацыі на Палесьсі.

Нешта падобнае мы відзелі даўней і па другіх частках Беларусі з партыяй „Wyzwolenie“. Гэтая партыя таксама не ганьбавала ніякай дэмагогіяй і сыпала абяцанак столькі, што нашаму сяляніну аж у галаве закруцілася... Затым таксама і „Wyzwolenie“ здабыло сабе на Беларусі добры лік пасольскіх мандатаў тры гады таму назад. А цяпер? Цяпер ад „Wyzwolenia“ і сьледу не асталося! Народ скора праканаўся, што ўсе тыя вызваленскія абяцанкі—гэта адна мана і ашуканства і што трэба здабываць зямлю і волю сваімі рукамі...

На зьмену „Вызваленьня“ прыходзе П. П. С. Яно пайшло не ў Віленшчыну і Наваградчыну, а ў палескую глуш, куды не дайшла яшчэ беларуская сьведамасьць. Яно добра ведае, што можа разьвівацца і істнаваць у нашым краі толькі апіраючыся на цемнаце, дык і зьвярнула сваю ўвагу на найцямнейшы куток.

Але мы таксама добра ведаем, што іхная работа ня мае ніякага грунту і яна таксама скончыцца як скончылася работа „Вызваленьня“. Але ўсёжткі яны беларусам шмат могуць напсаваць.

Найгорш тое, што яны пачалі выдаваць расейскія газэткі і праклямацыі. Каб хто даўней сказаў, што пэпээсы будуць русыфікатарамі ў нашым краі, дык мусіць ніхто не паверыўбы і самі пэпээсы такія словы ўважалі-б за вялікую для сябе абразу. Аднак цяпер яны моцна пашыраюць расейшчыну па ўсім Палесьсі і закладаюць нават расейскія школы... Вот да чаго даходзіць!

Што-ж на гэта мы беларусы?

Нам трэба зьвярнуць большую ўвагу на Палесьсе. Праўда, работы там многа, цямната вялікая і ворагаў шмат. Дык нашыя паслы павінны зьвярнуць сваю дзейнасьць на Палесьсе.

Спаміж усіх акругоў у Беларусі Палесьсе зьяўляецца найболей закінутай і глухой стараною, дык туды і трэба зьвярнуць найбольшую ўвагу.

Араты.

Сяляне! Чытайце і пашырайце сваю газэту „Сялянскую Ніву“!

Прысылайце грошы на газэту і адрасы Вашых знаёмых!

— „Грамадзяне! Перад усім дазвольце вам шчыра падзякаваць за ваш одзыў. Гэтым вы паказваеце, што не закрываеце сваіх вачэй на недарэчнае ўзгадаваньне вашых дзяцей. Добры робіце прыклад. Думаю, што недалёка той час, калі ваш прыклад распаўсюджыцца па ўсіх вёсках“.

Паясьніўшы тое вялікае значэньне навучаньня дзяцей у зразумелай для іх мове, г. ё. у беларускай, і, азнаёміўшы прысутных з гісторыяй Беларусі, вучыцель запытаўся, ці згаджаюцца яны мець у сваей вёсцы замест польскае—беларускую школу. Нейкі час ішла між гаспадарамі гутарка, якая выявіла, што ўсе ахвотна згаджаюцца на беларускую школу. Мала таго, нават абяцалі сякую-такую матар'яльную дапамогу вучыцелю на выпадак нязгоды ўлады плаціць яму ўтрыманьне. Але на думку сялян было небяспечна рабіць гэты крок, таму што адміністрацыя ў гэтым можа ўгледзіць нейкі бунт. Тут трэба яшчэ дадаць, што гэты сход быў скліканы без дазволу паліцыі солтысам гэтае вёскі А. Машкевічам, які ёсьць сапраўды шчырым і сьвядомым беларусам. Ён шмат чаго добрага зрабіў дзеля пашырэньня беларускае сьведамасьці. Ня ведаю, ці хто-небудзь з солтысаў другіх вёсак згадзіўся-б склікаць сход на сваю адказнасьць і яшчэ ў 1921 г.? Думаю, што не.

Вучыцель пачаў выясьняць прысутным, што на падставе канстытуцыі польскай рэспублікі Беларускі Народ маець поўнае права на родную школу.

— „Гэтае права—гаварыў ён далей—вам ніхто ня сьмеець адабрыць. Толькі мусіце вы самы добра пільнаваць, каб гэтае права ня было надужывана польскаю мяйсцоваю адміністрацыяй. Тое, што польская адміністрацыя пастараецца ўсадзіць кій у нашыя калёсы—гэта факт. Да гэтага трэба быць ужо наперад прыгатаванымі. Але на такія зьявішча ня трэба зьвяртаць увагі, а дамагацца свайго. Калі мы будзем цьвёрда стаяць за сваё дзела, дык вас, грамадзяне, запэўняю, што мы даб'ёмся таго, чаго жадаем...“

Гутарка вучыцеля саўсім успакоіла сялян. Цяпер заставалася толькі напісаць пратакол і яго падпісаць. За хвілю ўсё гэта была зроблена. Сяляне, здаволеныя з тае справы, якую выканалі, пачалі расхадзіцца па хатах. Было ўжо 10 гадзін вечара, як вучыцель разам з солтысам астатнімі пакідалі будынак школы. Пратакол і заяву на сходзе абмяркавалі паслаць у Белар. Цэнтральную Школьную Раду ў Вільні з просьбаю зрабіць адпаведныя крокі перад польскай уладай аб адчыненьні на будучы год беларускай школы. На другі дзень усё гэта было выканана.

Пацягнуліся доўгія дні, тыдні, месяцы—чаканьня... Сяляне часта пыталіся вучыцеля, што чуваць адносна школы, але потым відаць надаела ўжо, дый замоўклі... Ужо забыліся...

Быў сакавік 1922 г. Прыгрэла сонейка... Растаяла на вуліцы. Дзеці сваім вясёлым крыкам давалі знаць, што ужо збліжаецца вясна. Было 10 сакавіка. Дзень выпаў сонечны, ясны... На дварэ цёпла, пекна... Дзякуючы нізкай мяйсцовасьці у вёсцы і навакол яе сталася балота.

У школе „ідзець“ навука. Ды не сказаў-хы, што „ідзець“... Дзецям за зіму ўжо даволі збрыдла гэтая „abecadło“. А тут вясна на дварэ!... Няўважна слухаюць дзеці вучыцеля. Балей пазіраюць у вокны, на свабоду, на прывольле...

Была ўжо 3-я лекцыя, — аж раптам як у адзін голас дзеці закрычалі:

— „Пан вучыцель! пан інспэктар прыехаў“.

Дзеці адразу яго пазналі, бо быў ужо ў леташнім годзе. Надта хваліў вучыцеля, што ў школе ёсьць „postęp“. Яны часта гаварылі вучыцелю аб гэтым інспэктару, як аб добрым пану, які ўмее добра і ласкава пагаманіць. Ласкава... добра... А ня ведаеце, дзеткі, што гэты добры... ласкавы пан хацеў зрабіць з вас заклятых ворагаў сваіх уласных бацькоў і сваей Бацькаўшчыны?!... І вы таксама ня ведаеце, чаго ён так рана зьявіўся ў Ліхачы? Ня гледзячы на тое страшэннае балота і на тую адлегласьць (з Пружанаў да Ліхачоў 15 кілям.), гэты панок пастараўся чамусьці прыехаць іменна сягоньня. На рэвізіі школаў у гэткі ранні час ён ніколі ня езьдзіў. Дык якая маланка яго прынесла сюды? А вось якая. Налажыць сваю руку на беларускаю школу. Гэта-ж першы такі выпадак, што ў яго школьным павеце зьявілася дамаганьне аб беларускай школе. Ён, як добры патрыёта адразу зразумеў „небясьпеку“ тае новае „заразы“, якая зьявілася за 15 кіл. ад Пружанаў. Зразумеў таксама, што гэтая „зараза“, калі яе ня знішчыць, можа маланкаю разьнесьціся па цэлым павеце. А гэта было на яго думку немагчымым і недапушчальным. Беларуская людназьць у Пружаншчыне, як ня раз высказваўся п. інспэктар Алехоўскі, зьяўляецца надта „лёгкім“ і „прыдатным матар'ялам дзеля „перароблення“ яго на чыста польскі капыл. А тут на табе! Ні з таго, ні з сяго—загаварылі! Думкі і мары яго завялі...

Вучыцель, пачуўшы навінку, дзівіцца праз вакно і бачыць. Перад школаю, на вуліцы стаіць пара добрых коняў, запрэжаных у жоўтую панскую брычку. Коні мокрыя, як-бы з вады вылезьлі... Відаць добра змарыліся, бяднягі, пакуль давезьлі свайго пана да Ліхачоў... Дарога паганая, паганая... Калёса па калодкі ўлазяць у балота. Пан інспэктар зьлез з брычкі і, сказаўшы нешта фурману, пакіраваўся у школу. Гэтая раптоўная зьява інспэктара вельмі зьдзівавала вучыцеля. Ён сам ня мог вытлумачыць, што гэта можа значыць. Адно толькі сьцяміў, што „нешта“ ёсьць.

У час лекцыі інспэктар заўважыў вучыцелю, што дзеці ня ўмеюць папольску гутарыць.

— „Ужо два гады, кажа ён, як істнуець у Ліхачох польская школа, а дзеці папольску а ні гу-гу! Што за прычына гэтаму?“

Вучыцель трумачыў гэтаму „пэдагогу“, што з моваю трудна таму, што дзеці гавораць пабеларуску ўсюды: дома, у школе, на вуліцы і г. д.

Але п. інспэктар і слухаць не хацеў.

— „Калі захоча вучыцель, каб дзеці гаварылі папольску, дык хоць і з труднасьцямі, але даб'ецца гэтага“.

Як пацьверджаньне гэтага, ён узяў за прыклад адну вёску (ужо не памятую якую, здаецца Носкаўскай вол.), дзе за адзін год дзеці навучыліся добра гаварыць папольску. У пачатку інспэктар зрабіў высновак такі:

— „Я з усяго гэтага бачу, што ў ліхачоўскай школе навука выкладалася не папольску, а пабеларуску“.

Цяпер зразумеў вучыцель у чым справа.

(Далей будзе).

Ад Рэдакцыі.

БРАТЫ БЕЛАРУСЫ!

Ідэя адраджэньня Беларускага Народу ў апошніх часах пашырылася моцна. Калі яшчэ некалькі гадоў таму мала было чуваць пра Беларусь, то сяньня аб Ей гавораць усе...

Наш няшчасны Народ устае з векавога сну, каб самому каваць для сябе долю, бо праканаўся, што нашы дужыя суседзі толькі стараюцца нас выкарыстаць, а нічога добрага для нас не даюць.

Ад нашай дружнасьці і сьведамасьці залежыць наша сіла, а ад нашай сілы — залежыць наша доля.

Але ёсьць яшчэ куткі ў нашай Беларусі, дзе пра Беларусь мала чуваць, а калі што і чуваць, то людзі яшчэ не разумеюць у чым справа. Такім людзям трэба памагчы.

Беларуская сьведамасьць пашыраецца найбольш праз друкаванае слова—праз газэты.

Дык да Вас беларускія дзеячы зьвяртаемся з просьбай: *прысылайце адрасы Вашых знаёмых*, якія інтарэсуюцца палітычным жыцьцём і не чураюцца роднай мовы. Рэдакцыя пашле ім некулькі нумароў нашай газэты *дарма*—можа яны заахвоцяцца і выпішуць яе.

Прысылайце таксама весткі і карэспандэнцыі з Вашага боку.

Мы ведаем, што роднае слова гэта ўсё роўна, што зерня, кінутае ў ральлю... Яно спачатку быццам замірае, але потым усходзіць і дае вялікі ўраджай...

Дык няхай ня будзе ў нас такога цёмнага кутка, куды б не даходзіла беларуская газэта...

Чым болей будзе пашыравацца беларуская сьведамасьць, тым скарэй будзем прыбліжацца да сьвятлейшых дзён... да лепшай долі...

А лепшая доля залежыць ад нас самых!

РЭДАКЦЫЯ.

З Краю.

Колькі трудоў і грошай!

Газэты нядаўна пісалі, што ў Вялейцы адбылося сабраньне „Towarzystwa Opieki nad Kresami". Пастанавілі закладаць народныя дамы і пашыраць газэтку „Głos Wileński", якая мае быць органам гэтага Т-ва.

Цяпер ізноў чуем, што стварылася нейкая „Rada Opiekuńcza Kresowa", якая таксама пашырае сваю дзейнасьць на Віленшчыну, закладаючы народныя дамы, пашыраючы польскую літэратуру і ладзячы польскія спэктаклі. Кружкі („Koła") гэтай Рады быццам заснаваліся ў гмінах: Мосарскай, Войстамскай, Ільскай (Ілья), Дамушанскай (такой гміны няма!), Гарадоцкай, Касьценевіцкай, Жодзіскай, Камайскай, Кабыльніцкай і Сьвірскай. А народныя дамы заснаваны ў такіх мястэчках: у Мосары, Ладосях, Ілыі і Данюшаве.

А найцікавей тое, што гэтыя дамы на палавіну або і на тры чверці былі пабудаваны на кошт тэй „Рады!". Пытаньне: скуль „Рада" бярэ грошы на такія штукі? Ці не з народу? А калі яшчэ дабавіць „zapomogi" на ўстройства польскіх спэкулянтаў, то сапраўды дойдзім да праканаваньня, што пашыраньне польшчыны на „Крэсах" абходзіцца беларусам сялянам надта дорага.

Ды не адна такая „Рада" ёсьць! А яшчэ К. О. К. („Komitet Obrony Kresów"), а яшчэ З. Б. К. („Związek Bezpieczeństwa Kraju"), а яшчэ і „Straż Kresowa" — вот колькі панскіх арганізацыяў на нашага беларуса! А ўсе гэтыя арганізацыі на тое, каб падзяржаць польшчыну ў нашым краі! Слабая польшчына, калі трэба яе гатак моцна падзержываць!

Беларусы у Чэхаславакіі.

Праская арганізацыя Бел. Сялянскага Саюзу.

Арганізацыя гэтая была заложана вясною 1922 г. і ўвесь час складалася блізу што з адных беларускіх студэнтаў. У 1922—23 годзе арганізацыя выдавала сваю часопісь „Беларускі Студэнт". Арганізацыя ўвесь час упорна і стойка бараніла нацыянальныя і сацыяльныя правы беларускага сялянства, прыймаючы ўчасьце ў палітычным жыцьці і выступаючы на міжнародных сялянскіх зьездах, насколькі гэта дазвалялі заняткі яе сяброў.

Сёлета 12 лютага адбылася 5 я агульная, гадавая зборка гэтае арганізацыі.

Пасьля адчыненьня зборкі, воплескамі было прынята прывітаньне Беларускаму Сялянскаму Саюзу ў Заходняй Беларусі.

Па справаздачы старога прэзыдыуму і дэбатах агульная зборка пастанавіла павялічыць працу ў 1926 годзе.

Апрача таго аднагалосна прынята наступная рэзалюцыя—заклік да беларускае эміграцыі:

„Прыймаючы пад увагу а), што беларускае сялянства здолее асвабадзіцца і дабіцца сабе лепшае будучыні толькі арганізаваўшыся ў свой клясавы Беларускі Сялянскі Саюз і б), што арганізаваны летась у Заходняй Беларусі Беларускі Сялянскі Саюз ёсьць адзіным незалежна-нацыянальным кірункам беларускім, — 5-я гадавая агульная зборка Праскае арганізацыі Б. С. С. кліча 1) усіх думаючых пасялянску беларусаў уступіць у Беларускі Сялянскі Саюз, 2) усіх беларусаў бяз розьніцы кірункаў злучыцца каля Беларускага Сялянскага Саюзу".

На азначанай агульнай зборцы адбыліся перавыбары прэзыдыуму і рэвізыйнай камісіі.

Прывітаньне Беларускага Сялянскага Саюзу.

Пятая агульная зборка Праскае Арганізацыі Беларускага Сялянскага Саюзу шчыра вітае Беларускі Сялянскі Саюз і жадае яму ўдачы ў арганізаваньні беларускага сялянства Зах. Беларусі.

Нашая арганізацыя моцна верыць, што толькі клясавая арганізацыя беларускага сялянства асвабодзіць яго і ўвесь Беларускі Народ.

Прэзыдыум
Праскае Арганізацыі Б. С. С.

Склад новага ўраду Праскага Беларускага Сялянскага Саюзу.

Склад новага прэзыдыуму Праскае Арганізацыі Б. С. С. гэткі: старшыня—Вячаслаў Лаўскі, Praha—Žižkov Taboritská ul. š. 20 č. dv. XI; віцэ-старшыня і скарбнік—Адольф Клімовіч, Praha—Kr. Vinohrady Havlíčkova, č. 69; сэкрэтар — Хведар Клаўсуць, Radotin u Prahy č. 328.

З Польшчы.

Нарада групы Брыля і Домбскага.

Нядаўна адбыліся нарады новай партыі зарганізаванай праз прослоў Брыля і Домбскага. Прыехала каля 120 дэлегатаў з 82 паветаў. Галоўны даклад сказаў Домбскі, на каторым было прынята рад рэзалюцыяў, якія маюць насіць характар праграмны.

За галоўную прычыну гаспадарчага крызысу гэта група лічыць мілітарызм (ваеншчыну) і бюракратызм. Гэтыя расходы можна зьменшыць толькі праз увядзеньне Злучаных Штатаў Эўропы.

Дзеля таго, што войны вядуць клясы багатыя, то неабходнай зьяўляецца процiўдзейнасьць пры помачы адпаведных міжнародных сялянскіх арганізацыяў у рожных гаспадарствах і ў сваім краі. Гэтак новая група будзе старацца стварыць якнайлепшыя адносіны з сялянамі беларускімі і ўкраінскімі і падтрымліваць іх дамаганьнені аж да аўтаноміі тэрытарыяльнай.

Да цяперашняга ўраду група гэта даверу ня мае, дзеля таго лічыць неабходным якнайхутшэйшы роспуск Сойму і правядзеньне новых выбараў.

ХРОНІКА.

— **Выстаўка беларускіх тканін.** У працягу першага тыдня сакавіка мес. была адкрыта пры Універсытэце ў Вільні вельмі цікавая выстаўка беларускіх тканін і паясоў. Найбольш месца займалі дываны нашай вёскі з усіх паветаў Віленшчыны і з некатарых паветаў Горадзеншчыны.

Агулам выстаўка рабіла дужа прыемнае ўражаньне. Ладзіла яе група віленскіх палякаў з паняй Эрэнкройц на чале, каторая хоць чытае ў Універсытэце беларускую этнолёгію і адносіцца да нас даволі прыхільна, ня мела аднак адвагі назваць выстаўленыя экспанаты беларускімі, а толькі „тутэйшымі". Так прынамсі пісалася на афішах і іншых абвестках. Трэба усё такі цешыцца, што выстаўка не назвалася польскай. Дзякуем і за „тутэйшасьць!"

— **Нашто гэтае ашуканства?** Вярнуўшыся з Расеі пасол Мятла пачаў друкаваць у „Беларускай Ніве" свае ўспаміны з падарожы. Чытаючы ўсё тое, што відзеў і чуў у Расеі п. Мятла, дык нясьведамы чалавек можа падумаць, што там сапраўды рай. Людзі і накормленыя і сытыя і дагледжаныя—словам, няма ніякай бяды.

Аднак мы ведаем, што як усюды на сьвеце таксама і ў Расеі гора ёсьць многа. Людзі церпяць і голад і холад, ёсьць шмат сіротаў бяз прытулку нават у самай Маскве, шмат безработных, а ўжо пра жыцьцё вёскі няма што і гаварыць.

Ведама, што паслом не паказвалі гэтых бедакоў, але паказвалі тое, што было на паказ — а паказаць на'т у найбяднейшай старане заўсёды нешта знайдзецца—дык паўстае пытаньне, нашто пасол Мятла ўсё гэта разказвае?

Няўжо-ж п. Мятла настолькі не арыентуецца, каб не здаваць сабе справы з усяго таго, што яму паказалі?

А калі знае і ведае, то на што ашуківаць людзей?

Бо тыя людзі, якія варочаюцца з Расеі разказваюць, што цяпер, праўда, там лепш, чым было ў 1921—22 годзе, цяпер прынамся людзі з голаду ня мруць, але ўсётакі куды горэй, чым было перад вайною, ужо не гаворачы пра іншыя краі як Амэрыка або Англія.

Дык яшчэ раз пытаемся ў п. Мятлы, нашто гэтае ашуканства беларускага народу?

— **Літоўскія дамаганьні.** Як ведама, адносіны польскае ўлады да літоўскае людасьці, якая апынулася ў межах Польскае Рэспублікі, — зусім такія-ж, як і да беларусаў. Аб тым гавора мэморыял, які пададзены польскаму ўраду Часовым Літоўскім Камітэтам у Вільні.

Дамаганьні літвіноў гэткія: Адносна да сярэдніх школаў (прыватных) яны просяць наданьня ім правоў, дазволу выкладаць усе прадметы, апрача польскіх, у роднай мове, дапушчэньня здачы экзаменаў на атэстат дасьпеласьці ў той-жа літоўскай мове і... невыкіданьня вучыцялёў, якія „ня маюць абыватэльства".

Адносна да прыватных пачаткавых літоўскіх школ — просяць таксама не рабіць труднасьцяў, прычэпак вучыцялём, спыненьня і зачыненьня літоўскіх школ там, дзе ўрад адчыняе (нет ведама для кагo!) польскія казённыя школы, ды—дапамогі з дзяржаўнага скарбу літоўскім школам на тых-жа варунках, як даецца польскім прыватным школам.

Гэтыя слушныя дамаганьні выклікалі ў польскай нацыяналістычнай прэсе дзікі гвалт і нягодныя лаянкі.

— **5555 безработных у Вільні.** У апошнім справаздаўчым тыдні ў віленскім урадзе „Pośrednictwa Pracy" лічылася 5.555 душ безработных, з чаго выпадае: мужчын—4.006 і жанчын—1.449. Дадзена праца толькі 68 душам.

— **Курсы літоўскай мовы.** Віленская Куратория Школьнага Округу каля 15 красавіка гэтага году ладзіць курсы літоўскай мовы для вучыцялёў. Ці ня будуць гэта курсы для „казённых" вучыцялёў?

— **Афіцыяльны курс грошы на 12 сакавіка.** Даляр—7 зл 60 гр. Залаты рубель—3 зл. 91 гр.

НОВЫЯ КНІЖКІ.

Атрыманы транспарт новых кніжак:

1) Праф. **Віппэр**—**„Новая Гісторыя"** (на беларускую мову пераклаў К. Душэўскі) — 2 зл.
2) „ „ **„Навейшая Гісторыя"** (на беларускую мову пераклаў К. Душэўскі) — 2 зл. 50 гр.
3) **В. Ластоўскі**—**„Расейска-Крыўскі (Беларускі) Слоўнік"** 832 старонкі — 12 зл.

Беларуская Кнігарня
Вільня, Завальная вул. № 7.

У кнігарні можна купляць, або выпісваць па пошце ўсе беларускія кніжкі і падручнікі, беларускі адрыўны каляндар і кніжку — календар, а таксама польскія кніжкі падручнікі і ўсялякія пісьменныя прылады.

УВАГА: Грошы і заказы на кніжкі дзеля акуратнасьці найлепш высылаць па гэткаму адрэсу: **Вільня. Вострабрамская вуліца № 2 БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ. — Ст. Станкевіч.**

НОВАЯ БЕЛАРУСКАЯ КНІГАРНЯ СТ. СТАНКЕВІЧА

Вільня, Вострабрамская вул. № 2.

У КНІГАРНІ ПА НАЙТАНЕЙШЫХ ЦЭНАХ: кніжкі ўсіх беларускіх клясыкаў, школьныя падручнікі, кніжкі па гаспадарцы. Гумарыстычныя кніжкі і часопісі.

Вялікі выбар канцэлярскіх і пісьменных прыладаў.

Кнігарня высылае на правінцыю беларускія каляндары: 1) адрыўны (блёк) і 2) кніжку толькі па атрыманьні належных грошай.

УВАГА: У кнігарні прадаюцца польскія падручнікі і кніжкі па ўсіх галінах навукі.

Рэдактар-Выдавец: **Ст. Вольскі.** Друкарня **Н. Левін і Сын**, Вільня, Нямецкая 22.